## Тлумачальная запіска

Абагульняючы ўрок па гісторыі Беларусі ў 11 класе па тэме “Вынікі развіцця Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы” – гэта апошні ўрок у раздзеле III “Станаўленне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту”. Таму зразумела, што галоўнай яго мэтай павінна быць асэнсаванне вучнямі галоўных вынікаў развіцця дзяржавы ў разглядаемы перыяд. Вельмі важна, каб вучні разумелі не толькі поспехі, дасягнутыя нашай краінай, але і тыя праблемы, што востра стаяць перад намі. Вучні павінны ўсведамляць сябе часткай беларускага народа, і разумець, што менавіта ім праз некалькі гадоў прыйдзецца адказваць ужо не на пытанні настаўніка, а на пытанні, што будуць стаяць перад нашай дзяржавай.

Дадзеная распрацоўка прадугледжвае прымяненне разнастайных форм, метадаў і прыёмаў навучання, што дазволіць мяняць віды дзейнасці, ствараць сітуацыі, павышаючыя матывацыю вучняў, павысіць іх працаздольнасць.

Галоўным чынам, вучні на ўроку працуюць у групах, але ў кожнага члена групы ёсць свая канкрэтная задача.

Зыходзячы з таго, што на ўроку разглядаюцца многія неадназначныя праблемы, проста неабходным становіцца выкарыстанне дыскусіі. Не лішнім будзе адпрацоўка храналагічных ведаў вучняў, работа з дакументамі.

Яшчэ адным фактарам паспяховасці дадзенага ўрока з’яўляецца абавязковае азнаямленне вучняў на папярэдніх уроках раздзела з тым матэрыялам, што змешчаны ў хрэстаматыі, а таксама з дадатковым матэрыялам, які, у прыватнасці, адлюстроўвае стан прыватызацыі, інвестыцыйную палітыку, перспектывы знешніх займаў у Беларусі.

Безумоўна, паколькі на дадзеным уроку завяршаецца вывучэнне III раздзела, неабходна арганізаваць напрыканцы яго правядзенне праверачнай работы.